*Тыдзень роднай мовы*

# Сустрэча з пісьменнікам




**У рамках прадметнага тыдня і да Дня роднай мовы ў сярэдняй школе № 38 адбылася сустрэча з пісьменнікам, нашым земляком, Уладзіславам Кавалёвым.**

Вучні 10 «А», 10 «Б», 11 «А» класаў у цёплай атмасферы слухалі жывое слова аўтара. Мы даведаліся, што Уладзіслаў Пятровіч ужо 30 год у літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Яго апавяданні, вершы, аповесці зачаравалі слухачоў душэўным лірызмам, праўдзівым словам пра наша сучаснае жыццё. Ён падараваў вучням свае апошнія кнігі: «Цветы для молодых», «И грусть, и радость...», «Стол находок». Пісьменнік паслухаў вершы - першыя пробы пяра тых, хто марыць у будучым стаць майстрамі слова, даў ім слушныя парады.

Такія сустрэчы прыносяць вялікую карысць вучням. Асоба аўтара, яго выказванні будзяць чытацкі інтарэс, спрыяюць выхаванню лепшых якасцей чалавека.

**Людміла ЦЫРКУНОВА,**
**кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры СШ №38**